**Цэна асобнаго нумэру 5 кап.**

Год першы. Вильня 2 (15) грудня (дзекабра) 1906 г. **№. 4**

# Наша Нива

## ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМИ

**ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ руским и польскими литэрами.**

Адрэс рэдакцiи и администрацiи:

**Вильня, Большая Погулянка д. № 17.**

Падписка принимаецца и прадаюцца атдзельные нумэры газэты: 1) У Кант. „Нашай Нивы“—Бальшая Погулянка дом № 17 кв. 20. 2) У Книгарни „Знание“ — Георгиеуски проспэкт дом № 14. 3) У Книгарни Литоуской М. Пясэцкой — Шлапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Цэна з перэсылкою и дастаукою да хаты: на 1 год— 3 руб., на 6 месяцоу—1 руб. 50 кап., на 3 мес.— 75 кап., на 1 мес.—25 кап. Без дастауки и перэсылки: на 1 год—2 р. 40 к., на 6 мес.—1 р., 20 к. на 3 мес.—60 кап., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 год—4 руб., на 6 мес.—2 руб., на 3 мес.— 1 руб. Перэмена адрэсу—20 кап.

Абъяуленя прымаюцца на наследняй страницы па 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукописы и корэспонденции, прысыланые у рэдакцию, мусяць быць чытэльна написаны з праудзиваю фамильею и адрэсом таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падписаць прозвищэ разомъ з фамильею, кали незахочэце, каб была надрукавана ваша праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия тольки для ведама рэдакции.

*Вильня 2/15 грудня (дзекабра).*

Газэты што дзень разносяць па ўсей Расеи ўсё горшые и горшые весьци. Грошы, каторые правицельство недаўно пазычыло за границаю, ўжо разыйшлися. Даўги заграничным Банком за апошние годы надта увяличылись. Працэнты растуць с кожным днём, а плациць их нима чым. Заграничные багачы — капиталисты ня хочуць болей пазычаць расейскаму правицельству.

Народ згалеў. Па гарадох шмат фабрык закрылося. Сотни и тысячы работникоў страцили той способ да жыцця, каторы адзин тольки и быў у их: нима каму прадаць сваю силу рабочую, нима заработкоў. Па вёсках ня лепей: ва многих месцох сёлета неурадзило, цэлые губернии асталися без хлеба. И вось гэты галодны абездолены народ ня тольки ня можэ плациць грошэй на гасударственые патрэбы, але *сам трэбуе* помочы ад гасударства.



**Мамонт**, самы вялики зьвер, яки жыў на зямли и даўно звёуся. Цяпер знаходзяць тольки яго косци.

Тым часам меж людзьми, што трымаюць власць над народам у сваих руках, знайшлися такие, каторые хацели пажывицца и на галодных мужыках.

Справа тов. министра Гурко и Лидваля — гэтаж сором перад усим светом.

З Парыжа тэлеграфуюць „Руск. Слову“, што радыкальные француские газэты вельми дзивуюцца, што справа Гурко-Лидваля вядзецца пры закрытых дзьверах. Газэта „Корresp. Russe“ пишэ, (у Сталичной Почци) што чорносотники усё робяць, каб Гурку зрабиць невинаватым; яны страшаць след-

ственую камисию што, кали гэтаго ня будзе, у их знайдуцца такие дакументы, каторыми яны могуць даказаць, што и ешчэ болей высокие чыноўники маюць *грэхи*. Аб гэтай справе усёж таки идзе слецтво, а скольки ёсць таких спраў, каторые ня выйшли и николи ня выйдуць на свет Божы?...

Але гэта не ўсё. Нягледзячы на ваенные палаження, на ваенно-палевые суды и разстрэлы (разстрэляно и павешэно да гэтуль — 443 чалавека), — успакаення нима.

Як видаць з усяго гэтаго, то выпутаць народ з вельми цяжкаго палажэння и недапусциць расхапаць у канец народные дабытки зможэ тольки такая Гасударственая Дума, у каторую выбяруць людзей, што будуць бараниць не интэрэсы Гурки, Лидваля и других таких дабрадзеёў народных, а будуць цьвёрда стаяць за народ и народные грошы.

# ДАРОГА.

Миж палей шыроких,
Як змея якая,
Цягнецца дарога,
Вуская, крывая....
На абапол грушы
Разраслися ў поли.
Низеньки яловец
Чахне, як ў няволи.
Тут мужык працуе,
Чорны ўвесь, як сажа.
Крыж на перакрэстку
Пра пакуту кажэ....
Коцицца цялежка,
Бъецца аб каменне.
Гаратай на поле
Глядзиць ў задуменни...
Ой, дорога — сцежка,
Вуская, крывая!
И ты, жыцце наша,
Ты, доля такая!

**Якуб Колас.**

# МАМОНТ.

Усё у нашым жыццю меняецца, усё пераходзе. Абецывали народу сбаботу, цяпер аб гэтым штосьци ня чуваць; была Гасударственная Дума, яе ужо нима — скора будзе другая; казали, што мужыкоу надзеляць зямлёю, цяпер аб гэтым штосьци прыцихли... Зменяецца усё так само и у нашай прыродзе, ва усём, значыць, тым, што нас акружае — на цэлым свеци. Была недауна вясна, траука зялянела, распусьцились дзярэуя, зацвяли па сенажацях кветки... Настала лета, яна змянилась восенью: пажауцела траука, апау лисць з дзярэуёу, кветкау нима ани звання.

Як дзень памаленьку зменяецца ночью, так и у жыццю нашым, у прыродзе усё зменяеццч адно другим, зменяецца паволи, цамаленьку и гэта павольнае зменянне у навуцы называецца э в о л ю ц и е й.

Зямля наша, на каторай мы жывем, па каторай ходзим, калисьци ня была падобна да цяперашней. Там гдзе калисьци были далины, цяпер стаяць горы, — там гдзе были рэки, цяпер их нима—там гдзе было морэ, цяпер суха — земля.

Калисьци уся Расея ат самаго северу — палуночы да лалудня, вот прымерам ат Архангельска да Астрахани — уся Расея была пакрыта толстым лёдам; лёд гэтый лежау на зямли круглые годы и цёк ён памаленьку як рэка, плыу паволи, але з вяликай силай. Сунууся ён сам па сябе бяз уселякай вады, забираючы па дарозе каменне, пясок. И перэнасиу ён их у далёкие мейсцы, гдзе ён их то пакидау, то зноу далей нёс з сабой. Каменне, што няслись з лёдам, шлифовались па дарозе аб сустрэчные прадметы. Гэтый увесь цэликом лёд называуся и нязываецца у навуцы л е д н и к о м, а той час, кали гэтые ледники на свеци найбольш были, называецца л е д н и к о в ы м п е р и о д о м. Што гэта ня видумка тые ледники и той ледниковый период — аб гэтым свядчаць тые атшлифованые каменне, што знаходзяць часам,— тые

горы зямли што бываюць панесены вот, прымерам, як у нас кале Вильни.

Аб гэтым нам кажэ навука, што называецца геолёгия, навука аб зямли, аб ей гисторыи, аб тым, як яна развивалась.

Але вернемся да таго лёду, што пакрываў усю Расею.

**Элька**.

(Далей будзе у № 5).

# З Беларуси и Литвы.

(ад нашых корэспондэнтоў).

**З Маладэчненской Сэминарыи.** Дырэктор Маладэчненской вучыцельской сэминарыи выиграў сваё дзела. Ен астаўся на старым месцы. Прашэння вучэники падаюць, яны видзяць, што нима чаго рабиць. Пан Цвирка прынимаець ат усих прашэння и абецуець, што усе вучыцца будуць. Кабы гэта была тольки праўда. Але як зробиць пан Цвирка так, як ён рабиў ў прошлые годы! То будзе кепска. Вучэники не бунтавали, але сабралися чалавек дзесяць паталкаваць а сваём жыцци. Гадыцкий даведаўся. На экзамене дзесяць чалавек было астаўлено на други год. Можэ пан Цвирка думае зрабиць и у гэтым гаду, так як ён рабиў тагды. **Сакерка**.

**Маладэчна**. Вучэники начальнаго вучылишча II и III аддзелення забаставали. Яны ня хочуць вучыцца ца таго часу, пакуль не перастануць их у школи биць, цягаць за вушы, лаяць и рабиць усё иншэе, што не падходзиць да навуки. Вучыцца прышли з II аддзелення чалавек шэсць, а з III— чатыры таких, якие были и у сэминарыи у часи забастоўки. (К).

**„Свабода сумлення.“** Ў лютым месяцы гэтаго року да каталицкаго пробошча ў мястэчку **Лужках** прышли Виктор Касникоўский, праваслаўный, з дзеўкаю Стэфкай Палынскаю, просячы, каб им даць у касцели шлюб, бо яны маюць права карыстаць з манифэсту 17 акцябра, ў каторым абъяўлена народу поўная свабода сумлення. Па гэтай прычыни пробошч, прачытаўшы запаведзи, павенчаў их. Поп даведаўся аб гэтым и, праз благачыннаго, пацягнуў пробошча на суд акружный за тое, што ня меў права венчаць праваслаўнаго. Чули мы, што суд будзе у Дзисне 4 грудня; а пакуль што пробошча палиция ўзяла пад „асобый надзор“. Дык вот якая „свабода сумлення!“

М. **Жыровицы,** Слонимскаго павету. Многа святаў бывае у Жыровицах, гдзе ёсць цудовны образ, але пярвейшэ свята — гэта на Пакрову. Многа збираецца сюды багамольцоў з усих старон. Так было и у гэтым року. Людзи стали ехаць за чатыры дни да самаго свята. Народу назбиралось уселякаго: были тут и паны, шляхта, и мужыки. Трэба сказаць, што кожнаму ведамо, што цяпер, гдзе збяруцца два мужыки, туды лезе и палиция, а тут, нима чаго и гаварыць, туды яе напёрло гэтульки, як прусакоў на свет у иншай хаци. Прышло и свята. Ад самаго ранку, пакуль у цэркви не служыли, то хто што купляў, хто што прадаваў, а хто што—каб и украсци. Як скончылась служба, — хто сюды, хто туды, а палиция тож пашла трошки падчубарыцца. Кале трэйцей гадзины палиция стала збирацца да хаты, але убачыла, што пасерод рынку стаяло спакойне пяць, а каб не залгаци, можэ шэсць чалавек. Доўга не чакаючы, палиция и кажэ им: „Чаго вы гэта стаицё? едзьце да хаты“ — „Кали вы, паночки, хочэце ехаць, то едзьце сабе, а мы гэта ничога кепскаго ня робим“. — „Идзи, я табе кажу“, и доўга ня думаўчы ляп яму па твары, а потым у спину кулаком и гэтак далей. Мала гэтаго: каб быць не винаватаму, трэба завесци яго да старшэй палиции и там тож на яго накаркаць.

Здаецца мало было видаць людзей, а як тольки зрабили гармидар, то з усих старон павалиў народ. Ен и стау дапытывацца у палиции, за што яна бьецца, але палиция яму закрычала у атвет „маўчаць“. — „Што, маўчаць“, стало чуваци, „што у цябе блишчашчые гузики, то ты думаеш“, што вяликий пан. Хоць ты и стражник, але таки самы мужык и ты и твой бацька, як и я“. Але тут ужо палиция пусцила у ход бизуны и шабли и стала секчы направо и налево. Немало народу памарнавали. Так гаспадарыла палиция, пакуль не прышоў асэсар и не сказаў „давольно, братцы!“

Пасля такого справунку, гдзе ни глянь— той без уха, той без носа, той з акрываўленой тварою, той з перабитаю рукою, а там пад плотам ляжыць чалавек, у каторага палиция прабила шабляю жывот да почак. Бяруць яго и цягнуць беднаго да

асэсара. Убачыў станавы, што кепска прыходзиць, узяў ды и атправиў яго у Слоним да бальницы, гдзе небарака на други дзень и аддаў Богу душу.

От якие настали часы, били многа народу на вайне, а цяпер бьюц яго не мало и без вайны. **Невядомы**.

**У Минской** губэрнии злучылися у адно ўсе тые саюзы, каторые ня хочуць дапусциць ў Расеи народнаго упраўлення и называюцца „истинно-русскими". Да их належыць „Саюз 17 акцябра" и „Саюз активной борьбы с рэволюцией" (што ўсеми силами хочэ прыдушыць рэволюцию). Як пишэ газ. „Вол.", да их належаць тольки праваслаўные свяшчэники (па прыказу сваего начальства) и земские начальники. З народу нихто их ня слухае.

**Минск**. У нядзелю адбылося прадвыборное сабранне гарацких выборшчыкоу; сабралося болей як 600 людзей; было тут рознаго народу. Гаварыли чаго можна чэкаць ад другой Гасударственной Думы, гаварыли, што трэба выбраць такого чалавека у Думу, не уважаючы на тое, чы ён беларус, чы паляк, чы хто други, абы тольки ён быу чалавек цьвёрды и смела дабивауся свабодных парадкоу. Адзин гаварыу так, што мусиць трэба ешчэ разагнаць и другую Думу и трэцью ды, каб Японцы ешчэ разок нас пабили, а тагды зможэм назваць сябе свабодными гражданами. Хутка будзе склкано новое сабранне, на которым згаворацца, каго выбраць у Думу. шчастны.

З двадцаць чацьвёртаго листопада (ноябра) у **Ошмяне** (Вил. губ.) засядау Окружный Суд па угаловному, крыминальнаму атдзелу пры учасци прысяжных заседацелёў. Адным з найцекавшых дзел, што слухаў суд, было дзело разбираўшэеся 25-го у суботу. Аб им будзе ў № 5.

# ДУДАР.

(Казка).

Тром родным братом Бог даў адзинаки розум, адзинакие мысли и думки. Тольки не адзинакая доля спаткала кожнаго брата у жыццю. Хоць усим братом ня вельми салодка жылося, але Меншаму Брату выпала самая горшая доля. Прысудзила яна яму самы горшы куток, кинула меж мхоў и балот. Кепска жылося Меншаму Брату. Плакаў ён, и иихто не бачыў яго слёз, чы не хацеў бачыць. Спеваў ён и песни, доўгие, нудные песни, песни нядоли. Гаварыў и казки и тольки ў казках ён бачыў сябе шчасливым. Яго слёзы капали разам з расою на землю. Грэла сонцэ и слёзы, змешаные з Божэю расою, падымалися к небу и адтуль кидалися назад на землю чыстыми капельками. И так яны вечна кружацца з зямли на небо, з неба на зямлю. И николи не высыхали вочы Меншаго Брата. Тоўсты, высоки лес адзин тольки слухаў яго песни и сам памагаў яму спеваць сваим доўгим шумом. Выхадзиў Меншы Брат у вечэр на двор, браў сваю дудку, садзиўся на прызби сваёй хаты и граў. Месячык пациўся па неби, плыли белые хмарки. Божые зорки, як соромяжливые дзеўчатки, пазирали на зямлю праз белые, тонкие хмарки и слухали Меншаго Брата, як граў ён на дудцы. И циха было на сэрцы, як циха была сама ночка. И думки, як тые хмарки, лёгка радзилися ў сэрцы, и плыли яны Бог знае куды, далёка — далёка, умирали циха-циха, як паволи раставали и белые хмарки ў неби. Тольки пугач и сова злым крыком сваим будзили ад шчасливых думак Меншаго Брата. Ен прачынаўся, як ад сну, и думки другие, думки нядоли, як нажом, калоли яму ў сэрцэ.

Ни думак, ни песень яго нихто ня знаў и ня чуў, чы не хацеў знаць и чуць. Яго скарга прападала, як прападаў туман з усходам сонца, што висеў над балотам. Разбираў яго адзин тольки лес, и лесу адкрываў Меншы Брат свае думки, бо людзи смеялися з яго слоў и песень. А з лесом жылося вальней: лес не давиў яго, не гнаў, як гнали и давили яго людзи. И Меншы Брат зрабиўся цихи, спакойны, асцярожны и никому не адкрываў сваей душы. Меншы Брат адзичаў. Лес и балоты адгарадзили яго ад Божаго свету.

Прайшло многа часу.

Ўсе тры браты сустрэлися.

Старшы Брат пазiраў смела. Ен быў у ботах, у крамных портках и кашули, а паверх кашули — камзэлька. Гаварыў Старшы Брат скора, мова яго была адметна, и Меншы Брат ледзьве мог разбiраць яго.

На Сярэдним Брату была высокая шапка, шырокие белые портки, боты. Ў зубах— круглая люлька на каротким цыбуку, гаварыў ён мало.

Меншы Брат выглядаў старэйшым за их абодвых. Барада яго была сивая, руки дрыжали. Сам ён быў тонки, худы. Яму як бы брыдка было прэд братами, што на ём сивая рваная свитка, круглая шапка — кучомка: на нагах лапци, а каравые анучы абвивали худые ноги.

Гаварыли браты аб усём: а горкай сваей доли, а праўдзи, а жыццю.

Меншы Брат маўчаў. Яму не давали гаварыць на той мови, на каторай гаварыў ён сам з сабою, з сваими думками, з лесам. З яго мовы смеялися старшые браты.

— Гавары ты так, як гавару я, — кажэ Старшы Брат — и не страхай ты мову люцкую. Твая мова — немая мова. Што сказаў ты свету на сваим языку? Дзе песни твае? Хто чытаў твае думки, работу твайго розуму и сэрца? Дзе песняры тваи? Чым ты пахвалишся?

— Лепшэй мовы я ня чуў. Гавару, як знаю. Брат! хто доўга маўчаў, таму хочэцца многа гаварыць. А я маўчаў ўсё жыццё, и мне хочэцца гаварыць; не адбирай ты ад мяне хоць гэтаго права. Спытайся у хваёвых крыжоў. Яны табе скажуць пра мае думки. Мае думки написаны слезми, а слёзы разам з думками разплылися ў рэчцы. Вецер — песняр мой. Горэ и боль радзили мае песни, и слухаў их лес. Спытайся у леса—ён скажэ пра песни мае. Скажу табе казку. Пасадзиў пан дудара у глыбоким склепи, за каменые сцены. Кажэ яму пан: „Грай мне на дудцы, каб я чуў твае песни, и тагды я пазволю табе спеваць людзям песни, дарую право расказваць свету пра думки твае".

Праз каменые сцены не выбилася песня дудара, и нихто яго не пачуў. — „Ты павинен маўчаць! — кажэ пан дудару, — бо песня твая ничога не сказала майму сэрцу. Нехай астаюцца ў табе твае думки и песни". И дудара с таго часу слухало пустое поле, балота и лес.

Брат! усе мы шукали шчасця, тольки шли мы не адзинакими дарогами. Табе хоць трохи свяцило сонцэ, а я шоў, як у ночы. Запалим жэ мы лучыны и пойдзем ешчэ шукаць доли, будзем памагаць адзин другому, а як заблудзиць хто з нас, падамо яму голас. Ня смейцесяж, браты, и не адбирайце у мяне таго, што можэ адабраць тольки Бог!

И слёзы блишчали на вочах Меншаго Брата.

**Тамаш Булава.**

# Беларуская народная школа.

Писулька да Рэдакцыи.

Тольки што дастаў першы нумэр газэты „Наша Нива". Глянуў! Пачаў чытаць — сэрцэ забилася, забилася, слёзы бягуць и кругом пацямнела.... Здаецца, што усё, што тольки ёсць найлепшаго у свеци, звалилася адразу, и сам ня ведаеш, чы гэта сон, чы праўда?! Праўда и праўда! З гэтаю праўдай зваливаецца цяжкая зима усяго беларускаго народу. Засвяциўшаеся сонцэ атагрэваець сэрцэ гэтаго народу. А як мы ведаем, што сонцэм трымаецца ўвесь свет, видзим, што з вясны наша родная зямелька, як тольки атпусцицца, ешчэ з пад лёду выпускаець траўку, так и нашэ цяпер сэрцэ— сэрцэ цэлаго беларускаго народу, зачынаець выпушчаць гэтые першые, самые милые, вясенние пёрки — траўки.

Гэтую траўку нам и трэба старацца ўсими силами даглядаць, каб яна не зачахла, а разрасталася и йшла далей пышным ростом. Што нам для гэтато трэба рабиць? Адзин атказ на гэта: трэба школы, трэба навуки.

Вото-ж я и раскажу, як пачынаюць школьнае дзела другие народы. Жыву я на границы Польшчы и Литвы и тут прыглядаюся, як паляки аткрываюць свае школы.

У Варшави яны устроили колка пад названнем: „Мацерж Польска". Гэта колка сабралася з людзей з усяго Польскаго краю, каторые шчыра стараюцца па усим краю залажыць школы на родным сваим языку як

для малых, так и для вяликих. „Мацерж Польская“ маець па губэрнских и паветовых гарадох свае комитеты. У таки комитэт прымаюць кожнага, хто тольки хочэць працаваць на гэта народнае дзела. „Мацерж Польская“ па усим газэтам края пишэць да народу, просячы афяр, хто можэць и скольки хочэць грашми, книжками и хто чым тольки можэць каб памагали.

Паветовые и губэрнские комитеты робяць складки у народзи и цяпер ужо аткрыли и аткрываюць школы. У каторай вёсцы сам народ ня можэць утрымаць школы, там „Мацерж Польская“, куды з усих старон пасыпалися афяры, даець на утрыманне школы и вучыцеля грошы и книжки.

Вот я и мыслю, што и нам трэба так сама рабиць, як робиць „Мацерж Польская“. Трэба и нам усим як адзин чалавек стаць за гэтую работу, залажыць сваю „Матку Белае-Руси“, не жалець знасиць да яе ўсё, хто чым багаты, и тагды и мы завядзем свае школы ў нашай роднай беларускай мови. Кожны, хто не паверыць гэтаму, — глянь на сваих дзетак и ты адразу зразумееш, што гэта твая Богом прыказаная павинносць. Таким тольки парадкам мы памаленьку скинем з себя нашу цямноту н знайдзем дарогу для лепшаго жыцця.

**Янка Белый.**

Ад Рэд. Памешчаючы гэту писульку ў „Нашай Ниве“, рэдакция дае пачаток и мейсцэ у сваей газэци для таго, каб усе, каму справа беларускай народнай школы ляжыць на сэрцы, магли смела высказаць свае мысли и жадання аб ёй.

# З усих старон.

**Пецербург.** 22 листопада у 11 гадзини раницай памочник прыства 3-го участка спасской часци Н. А. Шэрэметов абхадзиў свой участак на Фонтанцы кале дому № 95. Раптам зьявиўся за им неяки малады хлопец, якбы работник. Ен сказаў слоў кольки, а пасля выхапиў з кишэни рэвольвэр „браўнинг“ и выстрэлиў нескольки разоў ў Шэрэметова. Пам. пристава быў смертэльна панены ў голаву и спину. За стрэляўшым начали гнацца. Атстрэливаючысь, ён раниў дворника и некую кабету (яны папраўляюццца), и хацеў схавацца ў суседним двары, але убачыўшы, што яго ўсё роўна зловяць, застрэлиўся сам на смерць.

Н. А. Шэрэметов, як усим ведамо, быў раней приставом ў Беластоку и там прыгатаваў пагром. Той, што ў яго стрэляў, прыехаў за им з нашаго краю.

„нов. газ.“

У **Пецербургу** пачала ужо рабату сваю комиссия для разследовання справы таварыша Министра ўнутрэных дзел Гурко и Лидваля аб пакупцы хлеба для галадаючых мужыкоў. Комиссия заседае тайна—никому нима ведама, што яна зробиць з гэтаю справаю.

У **Пецербургу** цяпер заседае суд над быўшым адмиралом Небогатовым. Судзяць яго за тое, што ён ў часи японскай вайны ў битви пры Цусиме аддаўся японцам ў няволю разам са сваим флотам. Небогатов и ўсе сведки паказываюць, што русские ваенные параходы были никуды ня годные и дзеля таго не магли ваеваць и здужаць японцоў. Небогатов, як сам кажэ, видзеў, што ўвесь яго флот згине ў той битве, и пажалеў нескольких тысячоў матросоў, дзеля таго и аддаўся ён японцам ў няволю, прынимаючы ўсю вину за гэта на сябе.

**У Маскве** скончыўся суд над 32 чалавеками, каторых абвиняли ў тым, што якобы яны належэли да паўстання, каторае было ў Маскве у грудню (дзекабры) прошлаго году. Абвинялись яны на 100 стацьи, каторая назначае кару смерци. Дзеля гэтаго справа тая была надта важная. Суд выслухаў кале 300 сведкоў. И вось, цяпер выяснилася, якие гэта „праступники“ тые 32 падсудзимых. Як пишэ газ. „Товарышч“, быў меж ими семнацацилетни хлопец Панов, — на яго нагаварыў владзелец дому за тое, што Панов хацеў сватацца за дачку яго проциў яго воли; ешчэ два падростки, што адабрали аружжэ ад гарадавых; быў 68-летни старык Струевич, пасля два санитары, што даглядали раненых и рэволюцыонероў, и салдатоў — без розницы. Далей быў „справедливы злодзей“ Невядомски — на яго нагаварыли неякая шлюха, с каторай ён жыў, и угалоўны арыштант, дый то па намови палиции; а ешчэ хромый без наги Колошын, аб каторым кажуць, што гуляў на барыкадах, так сама други калека без пальцоў, каторы ня можэ стрэляць, хоць бы и хацеў, а каторага обвиняли, што ён стрэляў. Абвиняемый за паўстанне Смирнов папаў на гэты суд за тое, што спеваў мар-

сыльянку праз цэлы месяц пасля паўстання, а на яго нагаварыў дворник; были и два вучни-гимназисты, што па няведама чыей просьби перэвазили аружжэ.

Ня гледзячы на усё гэта, пракурор у сваёй доўгай прамови, катурую гаварыў сем гадзин, трэбоваў для падсудзимых кары смерци. „Кара смерци, казаў пракурор, павинна *успакоиць* усю Расею“. Але суд не паслухаў пракурора: абвинення па 100 стацьи ён не прызнаў и асудзиў тольки двух абвиняемых за убийства на каторгу (на 8 годоў и на 2 г. 8 мес.), 14 асудзиў на арэштанцкие роты ад 1 г. да 3 лет, а астаўшыхся прызнаў саўсим невинаватыми.

---

## Аб усём па троху.

**Расходы на администрацию**. Як пишэ газэта „Товарышч“ у спакойным часи правицельства плациць пэнсии у год:

| | | |
|---|---|---|
| Варшаўскаму генэрал-губ. | 53,790 | руб., |
| Виленскаму « « | 24,000 | « |
| Стэповаму « « | 24,695 | « |
| Иркутскому « « | 26,000 | « |
| Туркестанскаму « « | 29,532 | « |
| Пецербурск. Градоначаль. | 13,500 | « |
| и яго памочнику | 6,500 | « |
| управляючаму яго канцылярыёй | 4,000 | « |
| Наместнику на Каўкази | 55,066 | « |

Як абъяўляюцца ваенные палажэння и иншые, то ўсе гэтые пэнсии увяличываюцца.
дзен. вил.

**Ваенно-палевые суды.** Газэта „Рэчь“ надрукавала надта цикавы прыказ надамурскаго генэрал-губэрнатора з дня 20 акцябра гэтаго году № 124; „китайски падданы Ушанлин за грабёж з аружжэм ў руках, зроблены 23 сенцябра сёлета у Владывостоку, *аддаецца пад ваенно-палевы суд. Заседанне суду пачнецца а 12 гадзини у дзень 22 акцябра, а прыгавор суду будзе споунены у ноч на други дзень у турме пасля заседання суду*“.

На штож тагды и суд, кали ешчэ раней, да суду, ведамо, яки будзе прыговор? пытаецца гэта газэта. (А трэба ведаць, што прыгавор таго суду — кара смерци).
дзен. вил.

**Ешчэ аграничэнне у выборах**. Таварыш министра ўнутрэных дзел Крыжаноўский разъяснiў губэрнаторам, што работники ў казённых винных складах не маюць права падаваць свой голас на выборах да Гасуд. Думы. „нов. газ.“

**Гасударственых даугоу** Расея павинна выплациць 7,841 мильён рублёў (сем тысячоў восемсот сорок адзин раз па мильёну руб.) „товар.“

**Парубка лесоу**. Газэты начали писаць, што памешчыки ва многих месцох вырубаюць свае лесы надта паспешна, сякуць их ў пень и навэт не глядзяць на тые законы, што устаноўлены для ахраны лесоў, каб саўсим ня згинули. Як кажэ „Новая Газэта“, у губернях олонецкой, ноўгородской, саратоўской и иншых, гдзе да гэтуль расли вяликие и пекные лесы, скора ўжо астануцца голые стэпы.

Якая шкода робицца для ўсяго краю, кали вырубаць лесы без толку, — лёгка сразумець: дзе вырубяць лес ў пень, гдзе нима „лясной гаспадарки“ ани парадку, там ён ня скора зноў вырасце; а як лесу будзе нехват, то з таго ўсим прыдзецца кепска. Недаўно, як мужыки вырубали лесы, их за гэта садзили па турмах; алеж мужыки — цёмные; а нашы памешчыки, здаецца, маюць болей свету за мужыкоў, дзеля таго павинны яны зразумець, што ня можна браць прымеру з саратоўских ды ноўгородских памешчыкоў, ня можна глумиць лесоў, што патрэбны ўсяму краю.

**Ешчэ раз аб Гурцы.** Таварыш министра ўнутрэнных дзел Гурко, той самы, каторы, як мы ўжо писали, так добра купиў хлеб для галодных мужыкоў, што таго хлеба яны и ня бачыли, цяпер зноў зрабиў „интэрэс“. Як пишуць газэты (Дз. Вил.), Гурко празначыў на абчэственые работы для мужыкоў саратоўской губ. адзин мильён шэсцьсот тысячоў рублёў и на сабранню аб гэтай справи 5 листападу (ноября) канешне трэбоваў, каб выдали гэтульки грошэй, як ён празначыў. Цяпер аказалося, што саратоўски губэрнатор и земство прасили куды менш грошэй. Чаму Гурко хацеў ўзяць болей грошэй, як была патрэба — гэта яму аднаму ведама. Каб жэ даведалися ўсе — мае быць следство над Гуркаю. Чы выяснiць яно праўду — ня ведаем.

# АБЪЯУЛЕННЯ.


**БЕЛАРУСКАЯ ВЫДАУНИЦКАЯ СУПОЛКА**

**„ЗАГЛЯНЕ СОНЦЭ И У НАШЭ ВАКОНЦЭ“**

**Абъяуляець усим прыяцелйом Беларушчыны:**

Прымаецца перэдплата на выданне „BIEŁARUSKIJE PIEŚNIARY“

У гэтым выданни будуць:

P. BOHUŠEWIČA: „Dudka Biełaruskaja“.
„Smyk Biełaruski“.
„Skrypačka“.

W. MARCINKIEWIČA: „Pan Tadeuš“ (Dwie pieršyje bylicy).
„Hapon“.
„Wiečernicy“.
„Ščyroūskije dažynki“.
„Staury—Haūry.

Усйо гэта выданне выйдзе 8 книжками, яны будуць рассылацца, як тольки выйдуць у свет. Першая книжка разашлецца за яки месяц.

Выданне будзе дваякае:

Дарагое на пекным чэрпаным паперы, у пекнай з беларуским узорам вокладцэ, с партрэтами песьняроу, наклееными на шурпаты папер — без перасылки **3** рубли, с перасылкою **3** руб. **30** к.

Таннае выданне, на добрым белым паперы у вокладцэ, с партрэтами песьняроу (тольки у перэдплаце) — **1** руб. **20** кап., с перасылкаю — **1** руб. **50** кап.

Вышоушы у свет усйо выданне разам и кожная книга па сябе будуць прадавацца, але ужо даражэй. Усйо выданне скончым найпазней за год.

АПРОЧ ГЭТАГО:

**Суполка „Загляне сонцэ и у нашэ ваконцэ“ выдала пакуль што и прадае:**

BIEŁARUSKI LEMENTAR abo pieršaja nawuka czytannia, cana 6 kapiejek.

PIERSZAJE CZYTANNIE DLA DZIETAK biełarusaū, napisała Ciotka, c. 6 k.

БЕЛАРУСКИ ЛЕМЭНТАР, або першая навука чытання, цана 6 кап.

ПЕРШАЕ ЧЫТАННЕ ДЛЯ ДЗЕТАК беларусаў. Написала Цйотка, цана 6 кап.

**УЗЯЛА НА СКЛАД И ПРАДАЕ:**

ВЯЗАНКА Янки Лучыны (Ивана Неслухоўскаго), цана 4 кап.

КАЗКИ. Выдаў А. К., цана 6 кап.

БЕЛАРУСКИЕ ПАЧТОВЫЕ ПИСУЛЬКИ:

Щчорсуны ў летко; Щчорсуны ў зимку; Пранцишэк Богушэвич (Мацей Бурачок) песьняр беларуски; Винцук Марцинкевич;—песняр беларуски; Мужыки спад Слуцка; Парабкова дворная хата; Дудар беларуски; Янка Лучына (Иван Неслухоўски)—песьняр беларуски; Вясковая баба с Трыбужкоў; Дом Тадэуша Косцюшки у Мэрэчоўшчыни. Цана кожнай 5 к.

Ўсйо гэта можна купляць ў глаўным складзи у Пецербургу, Васйлёў востроў, 4-та линия, № 45, кв. 16.

Хто купляе у глаўным складзе ня менш як за поўрубель, той ня плациць за прасланне почтаю. Малые грошы можна высылаць пачтовыми марками.

ХУТКА ВЫЙДУЦЬ: Гутарки аб неби и зямли.
Жалейка. Янука Купалы.

Грошы просим высылаць на имя **В. Столыгвы.**


Рэдактор - Выдауца **З. Вольски.**

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.